Дальнейшим рассуждениям и выводам следует предпослать большое и значительное ЕСЛИ. Действительно, в случае, если «сознательный реализм» Д. Хоффмана завоюет признание более или менее значительной части научного сообщества в своей области, – что, в свою очередь, напрямую зависит от успешности байесианского объяснения коллапса волновой функции – то истории придется навсегда распрощаться с одной из своих самых священных коров, представлениями отображения объективной реальности историческими источниками. Видимо, та же судьба ожидает и традиционное понимание самих источников как продукта этого отражения. Кроме того, физическое устранение объективной реальности из предмета спора между эмпириками и релятивистами в истории окончательно разрешит его в пользу последних. Однако и они не обойдутся без потерь, поскольку рассуждения даже о приближении к действительности тоже придется оставить. Объектом истории вместо того, что «было на самом деле», становится реальность взаимодействующих агентов сознания, для которых одной из форм адаптивного поведения становится создание репрезентаций прошлого. Сложность в том, что в таком случае научная история, по всей видимости, теряет какие бы то ни было преимущества перед другими репрезентациями – мифологической, эпической и др., становясь только «одной из». Попутно это может привести и к потере историей существенных отличий от литературного творчества (на что, собственно, и указывают деконструнструктивисты). Предметом истории, вероятнее всего, могут стать формы и методы создания таких нарративов, представленных в исторических источниках, и способы их легитимации и универсализации, т.е. согласования между собой и в рамках какого-либо сообщества и составления из них общей картины прошлого (в случае, если это происходит), принимаемой и разделяемой этим сообществом.

**Библиографические ссылки:**


1. Munslow, A. Deconstructing History / A. Munslow. – London and New York: Routledge, 1997. – 226 p.
2. Munslow, A. Book review: The New Nature of History: Knowledge, Evidence, Language by Arthur Marwick, Palgrave, 2001, pp. xvi, 334 / A. Munslow // What Is History [Electronic resource]. URL: https://archives.history.ac.u/history-in-focus/Whatishistory/munslow5.html..
3. Marwick, A. Author’s response: The New Nature of History: Knowledge, Evidence, Language by Arthur Marwick, Palgrave, 2001, pp. xvi, 334 / A. Munslow // What Is History [Electronic resource]. URL: https://archives.history.ac.uk/history-in-focus/Whatishistory/marwick2.html.
4. О’Брайен, Ф. Третий полицейский / Ф. О’Брайен; пер. с англ. Е. Суриц. – М.: Текст, 2013. – 254 с.
5. Хель, И. 10 интерпретаций квантовой механики / И. Хель // Hi-News.ru [Электронный ресурс]. URL: https://hi-news.ru/science/10-interpretacij-kvantovoj-mexaniki.html/amp.
6. Тулина, Е. Существует ли реальность? Да, но мы ее не видим (Дональд Хоффман на TED) / Е. Тулина // Моноклер [Электронный ресурс]. – [без даты] – Режим доступа: https://monocler.ru/sushhestvuet-li-realnost-donald-hoffman/ – Дата доступа: 09.11.2019.
7. Брокман, Дж. Во что мы верим, но не можем доказать: Интеллектуалы XXI века о современнной науке / Дж. Брокман; пер. с англ. – М.: Альпина нон-фикшн, 2011. – 336 с.
8. Гефтер, А. Профессор Дональд Хоффман против реальности / А. Гефтер // Fast Salt Times [Электронный ресурс]. URL: https://fastsalttimes.com/sections/persona/671.html.
9. Gefter, A. The Case Against Reality: Interview with Donald Hoffman / A. Gefter // The Atlantic [Electronic resource]. URL: https://www.theatlantic.com/science/archive/2016/04/the-illusion-of-reality/479559/.


УДК 902/904 (476): 930(476) «19»

## ПРАБЛЕМЫ ПАЧАТКАЎ БЕЛАРУСКАЙ АРХЕАЛОГІІ Ў ПРАЦАХ НАВУКОЎЦАЎ XIX СТ.

**А.У. Вайтовіч**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь; vaitovich.aliaksandra@gmail.com*

Разглядаецца пытанне аб тым, як інтэрпрэтавалі пачатковы этап станаўлення айчыннай археалогіі навукоўцы XIX ст. Адзначана, што праблема зараджэння археалогіі неаднаразова

закраналася спецыялістамі пачынаючы з 1850-х гг. Аўтары звязвалі заснаванне айчыннай навукі аб старажытнасцях з дзейнасцю розных даследчыкаў. Згаданыя разыходжанні растлумачваюцца выкарыстаннем розных крытэрыяў вызначэння пачаткаў археалогіі як навуковай дысцыпліны. Акрамя таго, асэнсаванне вытокаў мясцовай археалогіі ў значнай ступені было абумоўлена палітычнымі поглядамі аўтараў.

***Ключавыя словы:*** гісторыя археалагічнай думкі; археалогія Беларусі; XIX ст.

## ПРОБЛЕМЫ СТАНОВЛЕНИЯ БЕЛОРУССКОЙ АРХЕОЛОГИИ В РАБОТАХ ИССЛЕДОВАТЕЛЕЙ XIX В.

**А.В. Вайтович**

*Белорусский государственный университет,*
*пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь; vaitovich.aliaksandra@gmail.com*

Рассматривается вопрос о том, как интерпретировали начальный этап становления отечественной археологии ученые XIX в. Показано, что проблема зарождения археологии неоднократно затрагивалась специалистами начиная с 1850-х гг. Авторы связывали основание отечественной науки о древностях с деятельностью разных исследователей. Отмеченные расхождения объясняются использованием разных критериев определения начала археологии как научной дисциплины. Кроме того, осмысление истоков местной археологии в значительной степени было обусловлено политическими взглядами авторов.

***Ключевые слова:*** история археологической мысли; археология Беларуси; XIX в.

## PROBLEMS OF THE BEGINNING OF THE BELARUSIAN ARCHAEOLOGY IN THE WORKS OF RESEARCHERS OF THE XIX CENTURY

**A. U. Vaitovich**

*Belarusian State University, Niezavisimosti Ave., 4, 220030, Minsk, Belarus;*
*vaitovich.aliaksandra@gmail.com*

Deals with the issue of how the nineteenth-century scholars interpreted the initial stage of the development of local archaeology. It is shown that the problem of the origin of archaeology has been repeatedly touched upon by experts since the 1850s. The authors associated the beginning of the national science of antiquities with the activities of various researchers. The discrepancies noted are explained by the use of different criteria for determining the beginning of archaeology as a scientific discipline. Besides, the understanding of the origins of local archaeology was largely due to the political views of the authors.

***Key words:*** history of archaeological thoughts; archaeology of Belarus; XIX century.

Пошукі «бацькі» археалогіі вядуцца спецыялістамі на працягу больш стагоддзя (гл. бібліяграфію: [1, с. 42–48]). Даследчыкамі – прадстаўнікамі розных школ і традыцый – прапаноўваюцца шматлікія падыходы да высвятлення часу ўзнікнення гэтай навукі. Асноўная прычына разыходжанняў аўтараў заключаецца ў выкарыстанні адменных крытэрыяў вызначэння пачаткаў археалогіі як навуковай дысцыпліны.

Не назіраецца адзінадумства вучоных і ў дачыненні да праблемы нараджэння беларускай археалогіі. У гістарыяграфіі канца XX – пачатку XXI ст. зыходным пунктам у справе археалагічнага вывучэння тэрыторыі нашай краіны называецца дзейнасць Р. Бжастоўскага [2, с. 2], Т. Я. Нарбута [3, с. 72], З. Я. Даленгі-Хадакоўскага (гл., напр., [4, с. 101; 5, с. 111; 6, с. 202]), братоў К. П. і Я. П. Тышкевічаў (гл., напр, [7, с. 60–61, 65; 8, с. 53; 9, с. 276; 10, с. 21]). Ва ўмовах відавочнага ўзрастання інтарэсу археолагаў да ранняй гісторыі дысцыпліны паўстае заканамернае пытанне аб тым, як успрымалі пачаткі навукі нашыя папярэднікі. У апублікаваных гістарыяграфічных аглядах гэтая праблематыка не атрымала належнага асэнсавання [11, с. 6–10; 7, с. 4, 65]. Згаданым малавядомым старонкам гісторыі айчыннай археалогіі – вызначэнню адмыслоўцамі XIX ст. постацяў тых, хто «першы імпульс навуцы археалогіі надаў» [12, s. 26], – і прысвечаны прапанаваны матэрыял.

У якасці папярэдняй заўвагі неабходна падкрэсліць, што ў пазамінулым стагоддзі для пазначэння сучаснай тэрыторыі нашай краіны выкарыстоўваўся цэлы шэраг назваў. Цэнтральныя і заходнія абшары Беларусі, як правіла, называліся «Літвой» і «Руссю Літоўскай», паўночна-ўсходнія рэгіёны – «Белай Руссю» (гл.,

напр.: [13]). Згаданыя харонімы сустракаюцца і на старонках археалагічных публікацый.

Варта таксама ўлічваць, што ў XIX ст. змест паняцця «археалогія» адрозніваўся ад прынятага сёння. Напрыклад, у 1850 г. Я. П. Тышкевіч пісаў, што «прадметам гэтай навукі з'яўляюцца: мастацтва, архітэктура, забыткі старажытнай пісьменнасці, а таксама апісанне рэчаў, якія служылі для прынашэння святых ахвяр, ваеннага рамяства, упрыгажэння і выкарыстання ў хатнім жыцці» [14, s. 6]. Праз паўстагоддзя В. Шукевіч сцвярджаў, што археалогія «ахоплівае як усе сляды творчасці чалавека, якія праяўляюцца ў вырабах, што выкарыстоўваліся для паляпшэння ўмоў яго існавання, так і праявы думкі, якія выкрышталізаваліся ў міфах, звычаях і сацыяльных парадках» [15, s. 5]. Такая пашыраная, у параўнанні з цяперашнім днём, трактоўка прадмету археалогіі цалкам знаходзілася ў рэчышчы метадалагічных падыходаў, панаваўшых у тагачаснай навуцы ў Расійскай імперыі (параўн.: [16, с. 97–99; 106–107; 17, с. 172]).

Далей гаворка пойдзе выключна пра гістарыяграфію таго даследчага напрамку, які адносіцца да археалогіі на сучасным этапе развіцця дысцыпліны. Пры гэтым увага будзе скіроўвацца на аналіз не вузкатэматычных аглядаў літаратуры, абмежаваных апісаннем гісторыі накаплення фактычных матэрыялаў, але перадусім абагульняючых прац, што падсумоўвалі дасягненні ў справе вывучэння мінулага.

Першым, хто звярнуўся да асэнсавання «поспехаў археалогіі», быў А. К. Кіркор. У 1856 г. ён падвёў вынікі развіцця археалагічнай навукі ў першай палове XIX ст. На думку вядомага даследчыка і грамадскага дзеяча, «колыбелью первых основателей Археологии в Литве была Минская губерния. В ней родились: знаменитый Зориян Долэнга-Ходаковкий (Адам Чарноцкий) и основатель нашего Музеума Граф Евстафий Пиевич Тышкевич» [18, с. 31]. Апошняму са згаданых навукоўцаў, паводле А. К. Кіркора, і належыла «честь призвания к жизни Литовской Археологии» [18, с. 32]. Менавіта Я. П. Тышкевіч, сцвярджалася ў публікацыі, быў аўтарам прац, якія «в здешнем крае… проложили дорогу к развитию науки» [18, с. 33]. Адзначаючы відавочны недахоп даследаванняў па «літоўскай археалогіі», А. К. Кіркор узгадаў таксама творы Т. Я. Нарбута, падкрэсліўшы ўнёсак «Нестара літоўскай гісторыі» ў вывучэнне курганных помнікаў Лідчыны [18, с. 33–34].

У канцы 1860-х гг. праблемы пачаткаў археалогіі разглядаў К. П. Тышкевіч. У манаграфіі, прысвечанай курганам на тэрыторыі «Літвы і Заходняй Русі», славуты навуковец сцвердзіў, што вывучэнне айчынных старажытнасцяў не выйшла з узросту дзяцінства [12, s. 3]. Піянерам у справе ўсведамлення археалагічнага мінулага краю ён назваў Вацлава Севярына Ржэвускага [12, s. 3–5]. Гэты некалі слынны польскі вандроўнік, мемуарыст, паэт і ўсходазнаўца ў 1813 г. апублікаваў невялікую працу «Пытанні для вырашэння» («Pytania do rozwiązania») – дапаможнік па гісторыі, геаграфіі, астраноміі і граматыцы для навучэнцаў Кшамянецкага ліцэя. К. П. Тышкевіч адвёў тры старонкі свай кнігі цытатам з твору В. С. Ржэвускага, узгадваючы ў тым ліку такія пытанні: «… ці Літва мае права быць найважнейшай прасторай для пазнання першаснай гісторыі засялення паўночнай Еўропы?...Калі вандроўныя людзі патрабавалі помнікаў, пытаюся, што ў нас за магілы? На колькі класаў можна іх падзяліць? Адкуль тая назва паходзіць, можа і ці можа быць сувязь тых магіл з краінамі ўнутранай Азіі?». Падрабязнае цытаванне К. П. Тышкевіч завяршыў высновай, што «… пытанні Ржэвускага з'яўляюцца выклікамі чыста археалагічнымі для пакалення нашага, якое з усёй жарсцю за гэтую навуку ўзялося...» [12, s. 5].

Нараджэнне ўласна навуковай археалогіі К. П. Тышкевіч звязаў з дзейнасцю свайго малодшага брата – Я. П. Тышкевіча, адзначыўшы, што менавіта ён «першы курган …раскапаў і навукова вывучыў, першую кніжку аб гэтым напісаў» [12, s. 26]. Акрамя таго, К. П. Тышкевіч пералічыў імёны цэлага шэрага адмыслоўцаў, якія займаліся археалагічнымі даследаваннямі на тэрыторыі «Літвы», «Русі Літоўскай» і «Белай Русі»: А. К. Кіркора, Т. Я. Нарбута, А. А. Плятэра, У. А. Сыракомлі, М. Ф. Кусцінскага і інш. Напрыканцы гістарыяграфічнага агляду К. П. Тышкевіч сціпла ахарактарызаваў і свой дваццацігадовы навуковы даробак [12, s. 26–27].

У пачатку 1870-х гг. выйшла цэлая серыя публікацый, што закранaлі пытанні вытокаў айчыннай археалогіі. У 1871 г. Ю. І. Крашэўскі апублікаваў некралог аб няўрымслівым рупліўцы мінуўшчыны – К. П. Тышкевічу. Свайго героя вядомы публіцыст і краязнаўца ўшанаваў як «першага з літоўскіх археолагаў… а нават адзінага». Такую высокую ацэнку Ю. І. Крашэўскі аргументаваў тым, што менавіта старэйшы з братоў-навукоўцаў уласнаручна праводзіў раскопкі, у той час як усе іншыя даследчыкі карысталіся чужымі аповядамі і паведамленнямі [19, s. XII].

У 1874 г. убачыў святло артыкул аўтарства Я. П. Тышкевіча, прысвечаны світанку музейнай справы і археалогіі ў Літве [20]. У публікацыі звярталася ўвага на ўвядзенне ў лакальны навуковы ўжытак самой назвы навукі аб старажытнасцях. На думку стваральніка Віленскага археалагічнага музея, першым, хто выкарыстаў слова «археалогія» на нашых землях, быў Міхал Кірылавіч Баброўскі – вядомы ў першай палове XIX ст. славіст, багаслоў, даследчык сярэднявечных рукапісаў і старадрукаў. У 1829 г. М. К. Баброўскі апублікаваў двухтомную працу пад тытулам «Archeologia biblica», якая, па словах Я. П. Тышкевіча, прапаноўвала «тлумачэнне рэчаў рэлігійных і немясцовых» [20, s. 6]. Пачатак вывучэння айчынных помнікаў мінулага навуковец звязаў з дзейнасцю М. П. Румянцава, З. Я. Даленгі-Хадакоўскага, Т. Я. Нарбута. Акрамя таго, даследчык коратка распавёў і аб уласных дасягненнях на археалагічнай ніве [20, s. 8–10].

Адмысловы след у гістарыяграфіі археалогіі Беларусі пакінуў галіцкі паэт, фалькларыст, славіст і уніяцкі святар Я. Ф. Галавацкі. Працуючы ў Львове і адчуваючы пераслед з боку ўладаў Аўстра-Венгрыі за свае прарасійскія погляды, ён эміграваў у Расійскую імперыю. Пасяліўшыся ў Вільні, у 1868 г. ён узначаліў Віленскую археаграфічную камісію, а ў 1869 г. у якасці яе старшыні прыняў удзел у Першым археалагічным з’ездзе ў Маскве. Даклад Я. Ф Галавацкага аб археалагічных даследаваннях «в северо-западном крае» прапаноўваў даволі тэндэнцыёзную інтэрпрэтацыю гісторыі айчыннай археалогіі. Навуковец сцвярджаў, што «археологические исследования в этой стране начались только в последнее время на началах русских, верно соответствующих древнему быту земли и настоящим ее потребностям. С пятидесятых годов существовало в Вильне Археологическое общество, деятельность которого с малыми исключениями не принесло пользы науке…Вследствие усердной любви к науке бывшего попечителя Виленского учебнаго округа И. П. Корнилова положено начало ученым командировкам по западному краю…» [21, с. 147]. Я. Ф. Галавацкі падкрэсліў слабую ступень даследаванасці «этой стороны» ў археалагічным плане. «Краеугольным камнем археологической науки» ён назваў працы Карла Шмідта – старшыні археалагічнага аддзелу Віленскага археалагічнага музея, які на працягу амаль чатырох дзесяцігоддзяў вывучаў Рагвалодавы камяні пад Полацкам, а таксама курганы ў Гродзенскай і Ковенскай губернях [21, с. 151].

Цалкам адменны падыход да асэнсавання пачатковых этапаў станаўлення археалогіі выкарыстаў у 1892 г. буйны геолаг, палеантолаг і археолаг Готфрыд Асоўскі. Ён напісаў уступ да публікацыі В. Мяніцкага, якая ўводзіла ў навуковы ўжытак ліст Станіслава II Аўгуста Панятоўскага да памешчыка Р. Бжастоўскага [22]. Ліст «каранаванага археолага» ўтрымліваў пяць пытанняў, накіраваных на ўдакладненне вынікаў раскопак Р. Бжастоўскага ў Мосары. Манарх пытаўся пра наяўнасць труны, прасіў паведаміць пол памерлага, цікавіўся глыбінёй размяшчэння пахавання і высвятляў, што захавалася ў магіле апроч касцей [23, s. 285–289]. Г. Асоўскі вельмі высока ацаніў унёсак апошняга караля Рэчы Паспалітай у станаўленне мясцовай археалогіі і сцвердзіў, што «наканавана было той самай далоні … кінуць першае зерне на новую пашу айчынных ведаў, якая перад гэтым ляжала цалінай» [22, s. 285].

Такім чынам, праблема зараджэння айчыннай археалогіі неаднаразова закраналася даследчыкамі XIX ст. Першыя публікацыі, што разглядалі пытанні гісторыі навукі, з’явіліся ў 1850-х гг. Менавіта ў гэты час – на мяжы 1840–1850-х гг. – навуковая супольнасць Расійскай імперыі пачала праяўляць цікавасць да гісторыі і гістарыяграфіі вывучэння мясцовых старажытнасцяў [24, с. 20].

У тагачаснай літаратуры ганаровы тытул пачынальніка «літоўскай» археалогіі надаваўся розным асобам. З аднаго боку, навукоўцы зыходзілі з розных метадалагічных пазіцый. У якасці вядучага крытэрыя вызначэння пачаткаў археалогіі выступала распрацоўка навуковага метаду. У межах гэтага падыходу кандыдатамі на ролю «бацькі» археалогіі называліся Станіслаў II Аўгуст Панятоўскі, чые пытанні дагэтуль лічацца першым у гісторыі беларускай навукі кіраўніцтвам па правядзенні раскопак [25, с. 232], а таксама З. Я. Даленга-Хадакоўскі, Т. Я. Нарбут, К. І. Шмідт, Я. П. і К. П. Тышкевічы, якія прымянялі метады палявых даследаванняў на практыцы. У адпаведнасці з другім падыходам, прыкметай станаўлення археалогіі з'яўлялася пастаноўка навуковай праблемы. Прыярытэт ў гэтай справе замацоўваўся за В. С. Ржэвускім, які ўпершыню сфармуляваў пытанні, датычныя рэканструкцыі мінулага па рэчавых старажытнасцях, альбо за Я. П. Тышкевічам – як за аўтарам першых навуковых публікацый па археалогіі. З іншага боку, асэнсаванне вытокаў мясцовай археалогіі ў пэўнай ступені было абумоўлена палітычнымі поглядамі аўтараў. Найбольшай палітычнай ангажаванасцю вылучалася канцэпцыя развіцця навукі, прапанавая Я. Ф. Галавацкім.

**Бібліяграфічныя спасылкі:**

1. Клейн Л. С. История археологической мысли. В 2 т. Т. 1. СПб.: Издательство С.-Петербургского университета, 2011.
2. Лобач У. А. Курганы і гарадзішчы ў міфапаэтычнай карціне свету беларусаў // Вестник Полоцкого государственного университета. Серия А. Гуманитарные науки. 2007, № 7. С. 2–11.
3. Дабрыян А. А. Археалагічнае вывучэнне Гродзеншчыны ў XVIII – першай палове XX ст. // Веснік ГрДУ імя Янкі Купалы. Сер. 1. Гісторыя і археалогія. Філасофія. Паліталогія. 2011, № 1 (106). С. 71–81.
4. Карев Д. В. Белорусская и украинская историография конца XVIII – начала 20-х гг. XX в. в процессе генезиса и развития национального исторического сознания белорусов и украинцев. Вильнюс : ЕГУ, 2007.
5. Дучыц Л. Папярэднікі // Маладосць. 2012, № 8. С. 111–116.
6. Зайковский Э. О чём говорят камни... // Деды : дайджест публикаций о белорусской истории. 2012, № 9. С. 202–208.
7. Алексеев Л. В. Археология и краеведение Беларуси. XVI в. – 30-е годы XX в. Минск : Беларуская навука, 1996.
8. Краўцэвіч А. Археалогія ў вывучэнні старажытных усходнеславянскіх гарадоў (на прыкладзе Беларусі) // Гістарыяграфія і крыніцы па гісторыі гарадоў і працэсаў урбанізацыі ў Беларусі. Матэрыялы міжнароднай навуковай канферэнцыі (Гродна, 25–26 верасня 2009 г.) Гродна : ГрДУ, 2009. С. 53–62.
9. Пашык А. Археалогія ў музейных зборах на тэрыторыі Беларусі ў XIX – пачатку XX ст. // Гістарычна-археалагічны зборнік. 2010. Вып. 25. С. 276–280.
10. Дзенісенка А. П. Даследаванні Яўстафія Тышкевіча як крыніцы па беларускай гісторыі XIX ст. // «Долгий XIX век» в истории Беларуси и Восточной Европы: исследования по Новой и Новейшей истории : сб. науч. тр. 2018. Вып. 2. С. 21–25.
11. Каханоўскі Г. А. Археалогія і гістарычнае краязнаўства Беларусі ў XVI – XIX стст. Мінск : Навука і тэхніка, 1984.
12. Tyszkiewicz K. O kurhanach na Litwie i Rusi Zachodniej: studium archeologiczne. Berlin : Księgarnia B. Behra, 1868.
13. Дзярновіч А. Пошукі Айчыны : «Літва» і «Русь» у сучаснай беларускай гістарыяграфіі // Палітычная сфера. 2012, № 18–19 (1–2). С. 30-53.
14. Tyszkiewicz E. Badania archeologiczne nad zabytkami przedmiotów sztuki, rzemiosł itd. w dawniej Litwie i Rusi Litewskiej. Wilno, 1850.
15. Szukiewicz W. Szkice z archeologii przedhistorycznej Litwy. Cz. 1 : Epoka kamienna w gub. Wileńskiej. Wilno : skł. gł. w Księgarni Józefa Zawadzkiego, 1901.
16. Лебедев Г. С. История отечественной археологии. 1700–1917 гг. – СПб : Издательство С.-Петербургского университета, 1992.

17. Мельникова О. М. Археологическая журналистика и институциализация археологии в российской провинции // Археологія і давня історія України : Зб. наук. пр. К. : ІА НАН України, 2012. Вип. 9. С. 170-176.
18. Киркор А. Значенiе и успехи Археологiи въ наше время // Записки Виленской Археологической Комиссии. Ч. 1. Wilno : Drukiem Józefa Zawadskiego, 1856. С. 25–39.
19. Kraszewski J. I. Ś. P. Konstanty Hr. Tyszkiewicz // Tyszkiewicz K. Wilija i jej brzegi : pod względem hydrograficznym, historycznym, archeologicznym i etnograficznym. Drezno : drukiem i nakładem J. I. Kraszewskiego, 1871. S. IX–XIII.
20. Tyszkiewicz E. Archeologia na Litwie // Rocznik dla archeologów, numizmatyków i bibliografów Polskich. Rok 1871. 1874. S. 1–13.
21. Головацкий Я. Ф. Об Археологич. трудах и исследованиях в северо-западном крае // Труды Первого археологического съезда в Москве. 1869. Том I. М. : В Синодальной Типографии на Никольской улице. 1871. С. 147–152.
22. G. O. Król Stanisław August jako archeolog // Wiadomości Numizmatyczno-Archeologiczne. 1892, № 1/2. S. 284–285.
23. Mienicki W. Wykopalisko w Mosarzu // Wiadomości Numizmatyczno-Archeologiczne. 1892, № 1/2. S. 285–289.
24. Платонова Н. И. История археологической мысли в России. Вторая половина XIX – первая треть XX века. – СПб. : Нестор-История, 2010.
25. Добриян А. А. Развитие методики археологических раскопок в Беларуси в XVIII – начале XX века // Матэрыялы па археалогіі Беларусі. 2006. Вып. 12. С. 232–237.

УДК 94(476) «15/19»

## ИССЛЕДОВАНИЕ ЛАТИФУНДИАЛЬНОГО ЗЕМЛЕВЛАДЕНИЯ УЧЕНЫМИ БГУ В БССР

**А.Е. Веремейчик**

*Белорусский государственный университет,*
*пр.Независимости, 4, 220030, г.Минск, Беларусь; arh-muz@mail.ru*

Рассмотрены труды ученых Белорусского государственного университета в области формирования и развития латифундий белорусских землях. Определены периоды изучения латифундиальных владений в историографии БССР и дана их характеристика. Проанализирована степень разработки данной научной проблемы в изучении вопросов о видах хозяйственной деятельности, системе административного управления и судебного делопроизводства в вотчинных владениях и майоратах на белорусских землях.

***Ключевые слова:*** исследования; наука; историография; майорат; ординация; вотчина.

## RESEARCH OF THE LATIFUNDIAL LAND OWNERSHIP BY THE SCIENTISTS OF BSU IN THE BSSR.

**A.E. Veremeychik**

*Belarusian State University, Niezavisimosti Ave., 4, 220030, Minsk, Belarus; arh-muz@mail.ru*

The works of scientists of the Belarusian State University in the field of the formation and the development of latifundias of Belarusian lands are considered. The periods of studying latifundial possessions in the historiography of the BSSR are determined and their characteristic is given. The degree of development of this scientific problem in the study of questions about the types of economic activity, the system of administrative management and judicial records management in estates and majorates on Belarusian lands is analyzed.

***Key words:*** research; science; historiography; marjoram; ordination; patrimony.

Современная белорусская историография располагает значительным количеством работ, посвященных эволюции феодального землевладения. Однако процесс становления научной проблемы о собственности на землю и появлении латифундий занял продолжительный период в социально-экономической истории Беларуси.

Школа социально-экономической истории Беларуси зародилась в 20-е гг. XX в. Ее основоположниками по праву считаются М. В. Довнар-Запольский и В. И. Пичета.